УДК 392.1
ББК 63.5
Н301

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Пад рэдакцыяй* В. С. Цітова, доктара гістарычных навук, прафесара

*Рэцэнзенты:* Г. В. Штыхаў, доктар гістарычных навук, прафесар; Я. К. Адамовіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Н301 **Народныя** традыцыі і нацыянальная культура: Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 6—7 снеж. 2001 г.: У 2 кн. / Пад рэд. В. С. Цітова.— Мн.: БДПУ, 2003.— Кн. 2.— 122 с.
ISBN 985-435-390-7 (ч. 2)

Артыкулы, змешчаныя ў другой кнізе, прысвечаны гісторыі народнай адукацыі, этнапедагогіцы, традыцыйнаму фізічнаму выхаванню, методыцы выкладання народнага мастацтва, харэаграфіі, музычнага фальклору, а таксама актуальным праблемам аховы і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам і студэнтам ВНУ, усім, хто цікавіцца актуальнымі праблемамі нацыянальнай культуры Беларусі.

**УДК 392.1**
**ББК 63.5**

ISBN 985-435-390-7 (ч. 2)
ISBN 985-435-388-5

© Калектыў аўтараў, 2003
© ВВЦ БДПУ, 2003
© Вокладка. А. А. Пакала, 2003

ных учебных занятий. Широкие возможности могут открыться перед будущими учителями при организации в школе разнообразных видов декоративной деятельности. Чем больше они получили в вузе в процессе выполнения творческих заданий знаний, умений и навыков по ДПИ, тем успешнее будет их творческая работа с учащимися.


1. Данілаў В. М. Беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва // Пачатковая школа. 1998. № 9. С. 25.

2. Сахута Я. М. Фарбы роднай зямлі: Нарысы пра народнае мастацтва Беларусі: Кн. для вучняў. Мн., 1985.

3. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. Мн., 1989.



***Дз. М. Дубініна, Дз. У. Дубінін***

*г. Мінск*


## ДА ПРАЕКТА ПРАГРАМЫ ЭТНАГРАФІЧНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

Да сённяшняга часу ў Рэспубліцы Беларусь няма агульнай праграмы этнаграфічнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту. У нацыянальную праграму “Пралеска” уключаны асобныя напрамкі работы па азнаямленні дзяцей з народнымі традыцыямі беларусаў, якія ў большай ступені тычацца гульнёвага і мастацкага развіцця выхаванцаў. Што да этнаграфічнага матэрыялу, то ў праграме яму адводзіцца зусім мала месца. У выніку сапраўды мастацкі і выхаваўчы патэнцыял народнай культуры застаецца не запатрабаваным дашкольнай адукацыяй, гэта ў той час, калі большасць айчынных педагогаў (Г. Арлова, А. Грымаць і інш.) лічаць фальклорныя творы і іншыя этнаграфічныя матэрыялы асновай пачатковага выхавання, прыступкай, якая вядзе дзяцей да пазнання сусветнай мастацкай культуры.

Прадметам этнапедагогікі з’яўляецца педагагічная культура роду, нацыі і народнасці. У адпаведнасці з гэтым можна вызначыць структуру і змест праграмы, накіраванай на этнаграфічнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту.

“Спадчына” — менавіта так, на нашу думку, павінна называцца праграма, якая сваёй асноўнай мэтай ставіць выхаванне дзіцяці ў традыцыях айчыннай народнай культуры, фарміраванне беражлівых адносін і любові да яе.

Станаўленне светаўспрымання дашкольніка адбываецца, паводле праграмы, дзякуючы сродкам народнай педагогікі і блізкіх вобразаў

народнай культуры. Выхаванне міласэрнасці, дабрыні, павагі да старэйшых, працавітасці — запаветы народнай педагогікі, якія з'яўляюцца асноватворнымі ў змесце праграмы.

Структура праграмы павінна складацца з трох раздзелаў:

1) "Народазнаўства";

2) "Краязнаўства";

3) "Вусна-паэтычная творчасць".

Першы раздзел уключае звесткі аб народным календары, народных звычаях і абрадах, побыце беларусаў і пэўным ладзе іх жыцця, народным этыкеце, традыцыях.

Змест другога раздзела складаецца з ведаў аб прыродзе Беларусі, яе дойлідстве, помніках культуры і архітэктуры.

Трэці раздзел змяшчае вершаваныя фальклорныя формы, гульні, песні, танцы, народны тэатр, малыя жанры фальклору.

Па кожным з раздзелаў вызначаюцца задачы і змест работы ў адпаведнасці з узроставымі перыядамі развіцця дашкольнікаў.

Праграма павінна быць разлічана на тры ўзроставыя перыяды, кожны з якіх мае сваю вобразную назву. Малодшы ўзрост — 3—4 гады — "Забаўляначка". Гэта пачатак этнаграфічнай адукацыі дашкольнікаў. Вусна-паэтычная творчасць выступае першым спадарожнікам дзіцяці ва ўсіх відах яго дзейнасці. Сярэдні ўзрост — 4—5 гадоў — "Красачка". Дзіця знаёміцца з асновамі народнай культуры. Старэйшы ўзрост — 5—6 гадоў — "Жывіца". Адбываецца актыўнае творчае засваенне фальклору і этнаграфічнага матэрыялу.

Прапаноўваемы намі праект праграмы вылучаецца сваёй інтэгратыўнасцю і тым, што ён пабудаваны ў адпаведнасці з пераемнасцю і паўторнасцю цыкла народнага календара, што дае магчымасць дзіцяці на працягу 3 гадоў паслядоўна знаёміцца з традыцыйнымі звычаямі і абрадамі. Пры гэтым характар і змест фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу паступова ўскладняецца з кожным годам.

"Спадчына" адносіцца да таго варыянта праграмы, які можа быць цесна ўзаемазвязаны з усім адукацыйна-аздараўленчым комплексам заняткаў у дашкольнай установе. Змест праграмы можа дапаўняцца з улікам мясцовага рэгіянальнага этнаграфічнага матэрыялу. Акрэслены праект праграмы прызначаны для комплекснага этнаграфічнага выхавання дзяцей 3—6 гадоў у дашкольнай установе з беларускай мовай навучання.